**В. М. Петражыцкая,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **А. Я. Паўлава,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ГАДЗІННІКАЎ У БЕЛАРУСІ

Гадзіннік, паводле «Беларускай энцыклапедыі», – прылада для вымярэння часу [10]. Тэма гадзіннікаў у Беларусі асветлена нешматлікай літаратурай. Гэта публікацыі ў зборніках і перыядычных выданнях. У залежнасці ад паўнаты раскрыцця тэмы літаратуру можна ўмоўна падзяліць на тры групы.

Да першай можна аднесці невялікія публіцыстычныя даследаванні, якія даюць уяўленне аб некаторых гадзінніках агульнага карыстання ў Беларусі. В. Корбут у артыкуле згадвае пра некалькі вядомых гадзіннікаў у Беларусі: стары гадзіннік у Гродне, сонечны гадзіннік майстра Малецкага (I. Małecki) у вёсцы Ішчална (Шчучынскі раён), гадзіннікі на адной з вежаў Прывакзальнай плошчы і будынку па праспекце Незалежнасці, 16, у г. Мінску [7]. У артыкуле прыводзіцца шэраг меркаванняў, але некаторыя з іх патрабуюць праверкі. Напрыклад, што гадзіннік на Прывакзальнай плошчы Мінска быў выраблены больш за сто гадоў таму ў Германіі. Гэты факт адзначаюць і іншыя даследчыкі [6], але доказаў, якія пацвярджаюць яго, няма. Сам аўтар заўважае, што гісторыя дадзенага гадзінніка «не изобилует точными фактами» [7]. Знакавым хранометрам г. Мінска прысвечаны артыкул Г. Трафіменкі [12]. Аўтар паўтарае ўжо вядомае меркаванне, што гадзіннік на адной з вежаў Прывакзальнай плошчы трафейны і быў зроблены каля двухсот гадоў таму. Крыніцы для дадзеных сцвярджэнняў не прыведзены і патрабуюць праверкі. Як і іншыя факты, у прыватнасці па гісторыі стварэння гадзінніка, устаноўленага на фасадзе Галоўпаштамта. Шэраг цікавых фактаў прыводзіцца ў

артыкуле Н. Касцюковіч [8]. Усе гэтыя артыкулы не маюць характару сістэмных даследаванняў, звесткі ў іх фрагментарныя і носяць кампілятыўны характар.

Другую групу складаюць працы, што ўтрымліваюць спасылкі на дакументы і крыніцы. Даследаванне А. Мілінкевіча прысвечана ўнікальнаму помніку – гадзінніку гарадской ратушы ў Гродне, які ўпершыню згадваецца 25 ліпеня 1541 г. [9]. Гэта найстарэйшы аўтэнтычны гадзіннік у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Шэраг вядомых фактаў пра яго ёсць у розных артыкулах, у тым ліку В. Ганчарука [1]. А. Гарбацкім зроблена спроба невялікага даследавання гадзіннікаў агульнага карыстання ў г. Магілёве [2]. Як сцвярджае аўтар, першы такі гадзіннік у Магілёве з'явіўся ў 1686 г. на трэцім ярусе званіцы Богаяўленскага манастыра.

Асобна хочацца адзначыць працы А. Цітова, які многія гады займаўся вывучэннем гадзіннікавай справы ў Беларусі. Абапіраючыся на яго даследаванні, можна прасачыць шлях станаўлення гадзіннікавай справы ў нашай краіне [13; 14]. Манаграфія вучонага «Зэгармістры Беларусі. Гадзіннікавых спраў майстры (XVI – пачатак XX ст.)» стала вынікам шматгадовай працы. У ёй сістэматызаваны і прадстаўлены поўны спіс рамеснікаў-зэгармістраў, якія працавалі на тэрыторыі нашай краіны. Акрамя таго, асобны раздзел («Беларускія гарады і зэгарніцтва») прысвечаны гісторыі цэнтраў развіцця гадзіннікавай справы ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Полацку, Пінску і інш. А. Цітоў адзначае шэраг цікавых фактаў па гісторыі распаўсюджвання і выкарыстання гадзіннікаў на беларускіх землях. Напрыклад, з'яўленне першага стацыянарнага гадзінніка ў Мінску даследчык датуе канцом XVI – пачаткам XVII ст. [14, с. 20]. Інтарэс выклікае гісторыя зэгарнай вежы на былой Саборнай плошчы.

Трэцюю групу крыніц складаюць публікацыі, у якіх зроблена спроба даследаваць гадзіннікі ў музейных зборах Беларусі. Складана знайсці ў рэспубліцы музей, у экспазіцыі якога няма такога экспаната, як гадзіннік. Гэта адзін з самых запатрабаваных музейных прадметаў, бо валодае высокай ступенню атрактыўнасці. Нягледзячы на гэта, гадзіннікі ў музейных калекцыях Рэспублікі Беларусь практычна не даследаваны навукоўцамі.

З апублікаваных прац адзначым артыкул Л. Жук «Гадзіннікі французскіх вытворцаў у фондах музея-запаведніка “Нясвіж”» [4], дзе аўтар спрабуе прааналізаваць групы дадзеных экспанатаў. Аўтар прыводзіць агульную колькасць гадзіннікаў, якія знаходзяцца ў зборы музея, і колькасць гадзіннікаў, якія экспануюцца. Мэтай даследавання стала вывучэнне гадзіннікаў французскіх вытворцаў, а менавіта «Vincenti&Cie» («Вінцэнці і кампанія») і «Japy Freres» («Браты Жапі»). Аўтарам грунтоўна даследаваны выбраныя музейныя прадметы, паказана агульная інфармацыя па вытворцах. З 55 (на момант публікацыі артыкула Л. Жук) экзэмпляраў механічных гадзіннікаў з фондаў музея-запаведніка «Нясвіж» 25 з іх былі прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі. У артыкуле разгледжана 6 экзэмпляраў.

Аднаму з экзэмпляраў калекцыі гадзіннікаў са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь прысвечаны артыкул І. Зварыкі «Гадзіннік акадэміка Нікольскага. Невядомыя надпісы» [5]. Гэты гадзіннік экспанаваўся на выстаўцы «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: гісторыя і сучаснасць», якая праходзіла ў музеі ў 2016 г. Падрыхтоўка прадмета да выстаўкі стала падставай для яго дасканалага вывучэння. Больш даследаванняў гадзіннікаў са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – установы з самымі багатымі фондавымі калекцыямі – пакуль няма.

Артыкул А. Селівончык «Рэстаўрацыя і атрыбуцыя музейнага прадмета – насценны гадзіннік НД 433; Мг – “Музычныя інструменты і гадзіннікі”» [11] прысвечаны ў асноўным працэсу рэстаўрацыі гадзінніка з дапаможнага фонду Беларускага народнага музея архітэктуры і побыту. Аднак задачай спецыяліста, акрамя рэстаўрацыі, часта з’яўляецца і атрыбуцыя. Тым больш, як адзначае аўтар, калекцыя гадзіннікаў у музеі «не изучена и не атрибутирована надлежащим образом в силу недостатка информации» [Там жа, с. 109]. Вынікам даследчых пошукаў аўтара сталі ўдакладненая атрыбуцыя і адрэстаўраваны музейны прадмет.

Даследаванню музейных гадзіннікаў прысвечаны толькі адзінкавыя публікацыі ў зборніках, асобныя працы па адзначанай тэме адсутнічаюць. Пэўны інтарэс уяўляе даследаванне Л. Доўнар «Механічныя гадзіннікі ў Беларусі: стварэнне і ўдасканаленне» [3]. У ім зроблена спроба паказаць гісторыю

развіцця менавіта механізма гадзінніка і высветліць ролю беларускіх майстроў у прагрэсе тэхналогіі вымярэння часу.

Падводзячы вынікі, адзначым, што літаратура па гісторыі гадзіннікаў у Беларусі дастаткова фрагментарная. Пасля аналізу літаратуры па тэме можна вылучыць наступныя напрамкі даследаванняў: невялікія агульныя публіцыстычныя работы, асобныя публікацыі ў зборніках на тэму гадзіннікаў агульнага карыстання і невялікую групу артыкулаў, прысвечаных адзінкавым экзэмплярам гадзіннікаў з музейных калекцый Беларусі. Асобна адзначым блізкую да тэмы манаграфію А. Цітова. Абагульняючыя працы пра гадзіннікі ў музейных зборах Рэспублікі Беларусь адсутнічаюць. Тым не менш вышэйназваныя працы выклікалі інтарэс і сталі перадумовамі для глыбокай распрацоўкі тэмы даследавання гадзіннікаў у зборах музеяў Беларусі.

1. *Гончарук, В. В.* История городских башенных часов: часы Фарного костела в Гродно / В. В. Гончарук // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі: (да 880-годдзя горада) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 10–11 крас. 2008 г. / рэдкал. : А. І. Антоненка, А. А. Каваленя, Я. А. Роўба (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2008. – С. 154–158.

2. *Горбацкий, А. В.* История появления часов общего пользования в городе Могилеве / А. В. Горбацкий // Религия и общество – 16 : сб. науч. ст. участников XVI Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 22 апр. 2022 г. / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко, Э. В. Старостенко. – Могилев, 2022. – С. 200–201.

3. *Довнар, Л. А.* Механические часы в Беларуси: создание и совершенствование = Mechanical clocks in Belarus: creation and improvement [Электронный ресурс] / Л. А. Довнар // Перспективы социально-гуманитарного образования в технических учебных заведениях : сб. науч. ст. по итогам науч.-практ. конф., Минск, 9–10 дек. 2022 г. / редкол.: А. Н. Кукса, О. В. Лепеш, С. В. Боголейша. – Минск, 2023. – С. 52–58. – Режим доступа: https://rep.bntu.by/handle/data/126066. – Дата доступа: 13.03.2023.

4. *Жук, Л.* Часы французских производителей в фондах музея-заповедника «Несвиж» / Людмила Жук // Нясвіжскі замак: падзеі, асобы, спадчына : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвеч. 435-годдзю пачатку будаўніцтва Нясвіжскага замка, Нясвіж, 6–7 верас. 2018 г. / уклад.: А. У. Блінец, С. М. Клімаў. – Нясвіж, 2019. – С. 262–269.

5. *Зварыка, І.* Гадзіннік акадэміка Нікольскага. Невядомыя надпісы / Ірына Зварыка // Музейны весн. – 2018. – Вып. 6. – С. 93–98.

6. *Калинина, И.* Часы на Привокзальной площади – военный трофей с вековой историей [Электронный ресурс] / И. Калинина // Комсомоль-

ская правда. – Режим доступа: https://www.kp.ru/daily/26603.1/3620706/. – Дата доступа: 09.03.2023.

7. *Корбут, В.* Еще идут старинные часы / В. Корбут // Pro отдых : путешествие как образ жизни. – 2009. – № 1. – С. 12–15.

8. *Костюкович, Н.* С боем и песнями / Н. Костюкович // Where Minsk : ваш персональный гид : городской журнал. – 2019. – № 5. – С. 60–61.

9. *Мілінкевіч, А.* Гарадзенскі ратушны гадзіннік / А. Мілінкевіч // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 119–136.

10. *Сацута, У. М.* Гадзіннік / У. М. Сацута // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 4 : Варанецкі – Гальфстрым. – 1997. – С. 420–421.

11. *Селивончик, А. И.* Реставрация и атрибуция музейного предмета – настенные часы НД 433; Мч – «Музыкальные инструменты и часы» / А. И. Селивончик // Памяць продкаў праз музейны свет: мінулае, сучаснасць і будучыня музеяў пад адкрытым небам : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 26 кастр. 2018 г. / склад. Я. І. Мікула. – Мінск, 2018. – С. 106–116.

12. *Трофименко, Г.* Бьют часы на старой башне / Г. Трофименко // Союзное государство. – 2019. – № 12. – С. 74–77.

13. *Цітоў, А.* Зэгармістры Беларусі / А. Цітоў // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск : НГАБ, 2006. – Вып. 4 / рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. – 220 с.

14. *Цітоў, А.* Зэгармістры Беларусі: гадзіннікавых спраў майстры (XVI – пачатак XX ст.) / А. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2017. – 158 с.

**К. А. Пилипенко,** *аспирант*
*учреждения образования*
*«Белорусский государственный университет*
*культуры и искусств».*
Научный руководитель – **Ю. П. Бондарь,**
*кандидат политических наук, доцент,*
*ректор государственного учреждения образования*
*«Республиканский институт высшей школы»*

# КРЕАТИВНОЕ ПРОСТРАНСТВО СОВРЕМЕННОГО БЕЛОРУССКОГО ГОРОДА: ФАКТОР СОЦИАЛИЗАЦИИ МОЛОДЕЖИ

В условиях возрастающей тенденции урбанизации становится актуальным анализ того, как современный город стремится обеспечить раскрытие творческого потенциала населения, в первую очередь молодежи. Необходимость реализации